Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-10-25

# На тым тыдні...

✓ **16 кастрычніка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **творчая сустрэча з паэтам і сцэнарыстам Уладзімірам Марозам.** Ён аўтар зборнікаў паэзіі «Пяшчотны дотык», «Голас», «Рэй», «Хутаранская зорка», «Дабрадаць», прозы і эсэ «Беларускі храм», «Мінск старадаўні і маладны» (4 выданні), «Мінск. Верхні горад», «Мінск. Плошча Перамогі», «За брамай забытых мелодый», «Магілёў» і іншых. Многія фільмы сцэнарыста адзначаныя прызамі і ўзнагародамі міжнародных кінафестываляў. На сустрэчы была прадстаўленая і новая кніга паэзіі Уладзіміра Мароза «Шляхцянка-восень», а таксама прайшла прэм'ера дакументальнага фільма «У пошуках новай зямлі». *Падрабязней чытайце на стар. 2.*

✓ **17 кастрычніка** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры прайшоў **творчы вечар паэтэсы Вольгі Норынай** пад назвай «Літаратурны кантэкст». Пад час імпрэзы прагучалі не толькі вершы з новага зборніка «Городская трава», які ўбачыў свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці», але і выступілі сябры творцы, калегі, песні на яе вершы выканаў бард Сяргей Панамароў.

✓ **17 кастрычніка** ў мастацкай галерэі «Палац мастацтваў» пачалі працаваць тры экспазіцыі:

персанальная **выстаўка акварэлі Уладзіміра Рынкевіча**, прысвечаная 60-годдзю мастака;

**Рэспубліканская мастацкая выстаўка,** прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа;

**выстаўка жывапісу «Далёкае блізкае»** прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў **Віктара Нямцова**, прысвечаная 70-годдзю мастака.

Выстаўкі можна наведаць да 28 кастрычніка.

✓ **18 і 19 кастрычніка** ў Беларускім дзяржаўным музеі беларускай літаратуры па ініцыятыве Інстытута імя Гётэ ў Мінску адбыліся **лекцыі Клаўса-Петэра Энгельхарда**, якія пазнаёмілі наведнікаў з нямецкай літаратурай: «Бі ў барабан і забудзься пра страх», прысвечаная Генрыху Гейнэ, які лічыцца «апошнім рамантычным паэтам», і «Шпацыр па нямецкай літаратуры» (на нямецкай мове з перакладам).

✓ Сёлета 15 снежня Беларуская чыгунка святкуе сваё 150-годдзе. Першай чыгуначнай лініяй на беларускай зямлі стаў участак Парэчча–Гародня, які знаходзіўся на чыгуначнай магістралі паміж Пецярбургам і Варшавай. Менавіта з моманту адкрыцця руху на гэтым адрэзку 15(27) снежня 1862 г. і вядзе сваё летазлічэнне Беларуская чыгунка. **18 кастрычніка** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя навукова-папулярнага выдання «История Белорусской железной дороги. Из века XIX в век XXI»**, якое пабачыла свет сёлета ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Кніга аб'ёмам больш за 950 старонак падрыхтаваная аўтарскім калектывам беларускіх гісторыкаў і супрацоўнікаў Беларускай чыгункі (кіраўнік – кандыдат гістарычных навук Валянціна Яноўская).

Да імпрэзы супрацоўнікамі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў падрыхтаваная **выстаўка «Беларуская чыгунка ад мінулага да сучаснага»**, дзе прадстаўлена больш за 100 дакументаў XIX–XXI стст. з фондаў бібліятэкі, якія распавядаюць пра 150-гадовую гісторыю беларускай стальной магістралі.

✓ **19 кастрычніка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася **выстаўка, прысвечаная 150-годдзю Беларускай чыгункі**, якую арганізавала Дзяржаўнае аб'яднанне «Беларуская чыгунка». Будзе працаваць да 12 снежня. *Падрабязней чытайце ў наступным нумары.*

✓ **20 кастрычніка** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылося адкрыццё літаратурна-мастацкай выстаўкі **«Ходзіць Сон ля вакон...»**, прысвечанай беларускім калыханкам. *Падрабязней чытайце ў наступным нумары.*

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні…